Землякі, якімі ганарымся

# Упарта на вяршыню ведаў

Іван Раманавіч Брайцаў нарадзіўся 14 студзеня (27 студзеня па н.с.) 1870 года ў вёсцы Забялышына Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні, (Зараз Хоцімскі раён). Бацька Івана, Раман Рыгоравіч, і маці, Еўдакія Фамінічна, былі непісьменнымі, як і усе сяляне ў той час. Аднак яны пажадалі бачыць свайго сына адукаваным чалавекам.

Цяжкім і доўгім быў шлях І.Р. Брайцава да вяршыняў матыматычнай навукі. Аб гэтым ён апавядаў у сваёй аўтабіяграфіі, якая захоўваецца ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Санкт-Пецярбурга разам з рэкамендацыяй прафесара П.А. Някрасава пакінуць І.Р. Брайцава пры фізіка-матэматычным факультэце Маскоўскага універсітэта для падрыхтоўкі да прафесарскага звання, і інструкцыяй для яго на перыяд гэтай падрыхтоўкі.

У аўтабіяграфіі Іван Раманавіч зазначае, што яго бацькі, сяляне, займаліся выключна земляробствам. Калі Івану споўнілася сем гадоў, бацька паслаў яго вучыцца ў народную сельскую школу. Потым Іван скончыў Клімавіцкае вучылішча і стаў настаўнікам Забялышынскай царкоўнапрыходскай школы.

Маючы вялікае жаданне атрымаць далейшую адукацыю, у маі 1886 года пераехаў у Маскву, дзе старэйшы брат Якуб служыў канторшчыкам у садавода Ф.Ф. Ноева. У Брайцава не было сродкаў наняць настаўніка і таму ён пачаў самастойна рыхтавацца да паступлення ў гімназію. Праз нейкі час, Іван Брайцаў ужо быў вучнем чацвёртага класа 6-ай Маскоўскай гімназіі. Вучыўся вельмі настойліва і ўпарта: у 4-м класе яго лічылі другім вучнем, а з пятага – першым. Сваім захапленнем матэматыкай, асабліва геаметрыяй, Іван Брайцаў абавязаны свайму настаўніку А.Н. Глаголеву. У хуткім часе стаў самастойна авалодваць матэматычнымі ведамі. У выніку без асаблівых цяжкасцей яму ўдавалася знаходзіць уласныя доказы тэарэм.

У 1892 годзе Іван Брайцаў паспяхова закончыў вучобу ў гімназіі і паступіў на матыматычнае аддзяленне Маскоўскага універсітэта.

За перыяд вучобы ва ўніверсітэце Іван Брайцаў заўсёды імкнуўся да самастойнай творчай дзейнасці. На трэцім і чацвёртым курсах ён выканаў два навуковыя даследванні, мог чытаць матэматычныя кнігі на французскай, нямецкай, англійскай, італьянскай мовах.

У 1896 годзе І.Р. Брайцаў скончыў універсітэт. Прафесар П.Н. Някрасаў прадставіў кіраўніцтву фізіка-матэматычнага факультэта наступную запіску: "Маю гонар рэкамендаваць факультэту, закончыўшага курс з дыпломам першай ступені, Івана Брайцава пакінуць пры універсітэце на кафедры чыстай матэматыкі з прызначэннем яму стыпендыі Міністэрства народнай асветы. Брайцаў як пры праходжанні ім універсітэцкага курса, так і па іспытах у фізіка-матэматычнай камісіі зарэкамендаваў сябе вельмі таленавітым і цікаўным маладым чалавекам. На выдатны яго курсавы твор аб алгебрагічных інтэгралах лінейнага дыферэнцыяльнага раўнання другога парадку я меў гонар своечасова звярнуць увагу факультэта і ўпэўнены, што ён здольны апраўдаць надзеі, ускладзеныя на яго прафесарамі матэматыкі".

У 1899 годзе Брайцаў паспяхова вытрымаў магістэрскія іспыты, прачытаў пробныя лекцыі і стаў прыватдацэнтам Маскоўскага універсітэта.

З 1900 года працаваў на кафедры матэматыкі Варшаўскага палітэхнічнага інстытута.

У 1904 годзе І.Р. Брайцаў абараніў дысертацыю і яму было прысвоена званне прафесар.

У 1908 годзе загадваў кафедрай матэматыкі Варшаўскага палітэхнічнага інстытута, адначасова пачаў працаваць у Варшаўскім універсітэце.

У 1907-1908 навучальным годзе ўдзельнічаў у арганізацыі палітэхнічнага інстытута ў г. Навачаркаску. Тут Брайцаў апублікаваў два навучальныя дапаможнікі для студэнтаў: па аналітычнай геаметрыі, па дыферэнцыяльным і інтэгральным злічэнні.

У гады першай Сусветнай вайны Варшаўскі палітэхнічны інстытут быў эвакуіраваны ў Ніжні Ноўгарад. (Да 1918 года усходняя частка Польшчы з Варшавай уваходзілі ў склад Расіі). На яго базе у 1918 годзе быў створаны Ніжагародскі універсітэт. Першым дэканам фізіка-матэматычнага факультэта гэтага універсітэта стаў Брайцаў. І да 1939 года быў нязменным дэканам, загадчыкам кафедры матэматыкі, а з 1942 года – кафедры тэорыі функцый, створанай па яго ініцыятыве.

У 1921 годзе быў адкрыты Беларускі дзяржаўны універсітэт. Праект першага навучальнага плана для фізіка-матэматычнага аддзялення педагагічнага факультэта БДУ распрацаваў І.Р. Брайцаў і актыўна ўдзельнічаў у рабоце камісій па арганізацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Інтэнсіўную навукова-даследчую працу Іван Раманавіч паспяхова спалучаў з педагагічнай дзейнасцю. Большасць матэматыкаў старэйшага пакалення ў Ніжнім Ноўгарадзе з'яўляліся яго вучнямі, многія скончылі аспірантуру пад яго кіраўніцтвам, зрабілі першыя крокі ў навуку.

У Івана Раманавіча і Наталлі Змітраўны Брайцавых было чацвёра дзяцей: Уладзімір, Мікалай, Вольга і Наталля. Іван Раманавіч ніколі не караў дзяцей, не крыўдзіў рэзкімі словамі, цудоўна іх выхоўваў. Яны выдатна вучыліся, атрымалі вышэйшую адукацыю. Вялікае гора двойчы напаткала сям'ю Брайцавых: старэйшы сын Валодзя, ужо будучы студэнтам фізіка-матэматычнага факультэта Ніжагародскага універсітэта цяжка захварэў і памёр. Сын Мікалай загінуў на фронце ў Вялікую Айчынную вайну.

За паспяховую навуковую і педагагічную працу Іван Раманавіч Брайцаў у 1944 годзе быў ўзнагароджан ордэнам "Знак Пашаны".

Іван Раманавіч працаваў да апошніх дзён свайго жыцця (памёр 4 студзеня 1947 года) . Адданы сваёй справе, патрабавальны да сябе і іншых, чалавек вялікай працаздольнасці, прафесар І.Р. Брайцаў быў прыкладам для навуковых супрацоўнікаў, выкладчыкаў і студэнтаў.

**Валянціна БАУРЫНА,**
**краязнаўца.**

**Баурына, В.** Упарта на вяршыню ведаў : [пра І.Р. Брайцава] / Валянціна Баурына // Шлях кастрычніка. —2010. — 2 ліпеня. — С. 9.